ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (823) ● Чацвер, 14 кастрычніка 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV



Паўнапраўным гаспадаром адчувае сябе ў 7 «А» класе сярэдняй школы № 4 г. Мінска студэнтка пятага курса філалагічнага факультэта Ларыса КУШНЯРОВА.

Студэнт прыйшоў у школу на практыку. Ён і сам быў зусім нядаўна вучнем. Прайшло якіх-небудзь чатыры-пяць год з той пары, калі сядзеў за вучнёўскай партай. За час навучання ў вышэйшай навучальнай установе набыў агульныя і спецыяльныя веды, у нейкай меры падрыхтаваў сябе і маральна да работы ў школе.

(Заканчэнне на 2-й стар.).



# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА
## ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ І ГУТАРАК СЯРОД СТУДЭНТАЎ
## НА ПЕРШАЕ ПАЎГОДДЗЕ 1971—1972 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

### ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА І ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

1. Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях палітычнага і эканамічнага жыцця ўнутры краіны і рэспубліцы (2—3 разы ў месяц).

2. XXIV з'езд КПСС і пытанні эканамічнай палітыкі партыі на сучасным этапе:

— Асаблівасці сучаснага этапа эканамічнага развіцця краіны і задачы дзевятай пяцігодкі.

— Удасканаленне ўпраўлення народнай гаспадаркай — адно з вузлавых пытанняў эканамічнай палітыкі партыі.

— Рост дабрабыту савецкага народа — вышэйшая мэта эканамічнай палітыкі партыі.

— XXIV з'езд КПСС аб ролі і задачах навукі ў будаўніцтве камунізма.

— XXVII з'езд Кампартыі Беларусі аб асноўных выніках выканання восьмай пяцігодкі і задачах развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1971—1975 гады.

### ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

1. Фарміраванне новага чалавека — адна з галоўных задач партыі ў камуністычным будаўніцтве:

— XXIV з'езд КПСС і пытанні ідэйна-палітычнага выхавання моладзі.

— Фарміраванне камуністычнага светапогляду і выхаванне класавай самасвядомасці моладзі.

— Савецкі характар (адданасць справе камунізму — вышэйшы прынцып нашай маралі).

— Выхаванне моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа.

— Барацьба супраць уплыву буржуазнай ідэалогіі на моладзь.

— Барацьба моладзі краін капіталу супраць ідэалогіі імперыялізму.

— Пытанні эстэтычнага выхавання студэнцкай моладзі.

### ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

1. Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях міжнароднага жыцця (2—3 разы ў месяц).

2. XXIV з'езд КПСС аб міжнародным становішчы СССР і асноўных напрамках знешнепалітычнай дзейнасці партыі і Савецкай дзяржавы:

— Сусветна-гістарычнае значэнне заваёў сусветнай сістэмы сацыялізму і перспектывы яе далейшага развіцця.

— Сучасны этап агульнага крызісу капіталізму і сусветны рэвалюцыйны працэс.

— Барацьба КПСС за ўмацаванне адзінства і згуртаванасці сусветнага камуністычнага і рабочага руху.

— Барацьба супраць антыкамунізму і антысаветызму — актуальная задача сусветнага рэвалюцыйнага руху на сучасным этапе.

— Міжнароднае значэнне XXIV з'езда КПСС.

# ВЫНІКІ КОНКУРСУ НАСЦЕННАГА ДРУКУ

Згодна з умовамі конкурсу 1970-71 навучальнага года, галоўнымі паказчыкамі дзейснасці насценнага друку факультэтаў і дзейнасці рэдкалегій былі: а) барацьба за выкананне задач, пастаўленых XXIV з'ездам КПСС перад савецкай навукай і вышэйшай школай; б) асвятленне сацыялістычнага спаборніцтва калектываў і ходу падрыхтоўкі да 50-годдзя Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Разглядалася ў сукупнасці дзейнасць усіх звенняў факультэцкага насценнага друку (факультэцкія, курсавыя, групавыя газеты, літаратурныя і сатырычныя выпускі, лісткі «Камсамольскага пражэктара»).

Конкурсная камісія, зацверджаная парткомам універсітэта, тры першыя месцы прысудзіла наступным факультэтам:

1. **Факультэту журналістыкі** (факультэцкая газета «Журналіст»).

2. **Філалагічнаму факультэту** (факультэцкая газета «Слова філолага»).

3. **Біялагічнаму факультэту** (факультэцкая газета «Vita»).

Камісія адзначае таксама плённую працу рэдкалегіі і дастаткова высокі ўзровень насценнай газеты матэматычнага факультэта «Рошым любую задачу».



*Напружана працуюць у гэтыя дні дыпломнікі хімфака.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

# КАНДЫДАТУ НАВУК — 20 ГОД

За новыя вынікі ў галіне дыферэнцыяльных ураўненняў 20-гадоваму матэматыку Паулу Панкову прысвоена ступень кандыдата навук. Гэтае рашэнне аднагалосна прыняў вучоны савет Акадэміі навук Кіргізіі, які прызнаў важнасць яго даследаванняў для раду прыкладных задач, напрыклад, у тэорыі аўтаматычнага рэгулявання.

За адзінаццаць гадоў замест шаснаццаці прайшоў П. Панкоў шлях ад першакласніка да даследчыка вышэйшай кваліфікацыі. Школу і універсітэт ён закончыў з адзнакай і цяпер з'яўляецца супрацоўнікам акадэмічнага інстытута фізікі і матэматыкі.

Яшчэ будучы студэнтам універсітэта, ён па-новаму рашыў адну з вельмі складаных матэматычных задач у галіне алгебраічнай тэорыі лічбаў. Шырока вядома «Табліца Панкова». Ёю карыстаюцца вучоныя, якія працуюць з радыёактыўнымі ізатопамі. Яна дае магчымасць біёлагам, хімікам, медыкам хутка вызначыць абсалютную радыёактыўнасць узораў, якія даследуюцца, з папраўкай на іх геаметрыю.

Кар. ТАСС.

г. Фрунзе.

● У ГРУПАХ І НА КУРСАХ

# МНОГА СПРАЎ, МНОГА КЛОПАТАЎ

Вучоба—не вясёлая прагулка, не лёгкае жыццё. Гэта, перш за ўсё, праца — і сур'ёзная. Першакурснікі адразу зразумелі гэта і па-сапраўднаму ўзяліся за навуку. Некаторыя з другіх курсаў рэзюміравалі:

— От, вам пашанцавала. Не паехалі на працу ў калгасы.

Мы ж іншай думкі. Наадварот, крыху засмучаны. Засмучаны тым, што не давялося прайсці выпрабаванне працай. Праўда, і ў вучобе, плённым удзеле ў грамадскім жыцці пазнаецца чалавек. І на нашым журфаку ўжо вызначыліся свае маякі-студэнты, якія сур'ёзна рыхтуюцца кожны дзень, актыўна выступаюць на семінарскіх занятках. У іх ліку Мікалай Дзянісаў, староста першай групы, Ганна Радзюк, сакратар камсамольскай арганізацыі другой групы, Зоя Гаўрышчук, член камсамольскага бюро курса, камуніст Віктар Супрунчук і многія іншыя.

Праведзен адбор талентаў у гуртboard мастацкай самадзейнасці. Цікавая дэталь: з песнямі, вершамі, танцамі выступілі амаль усе першакурснікі. І добра. Вялікае ўражанне засталося ад чытання баек К. Крапівы Дзмітрыем Новікавым. Выдзеліліся дэкламаваннем вершаў Тася Мікуліч, Вольга Ягорава і іншыя. Спадабалася выступленне салістаў Галі Матах, Мішы Шэлехава, Уладзіміра Грэбцава...

Адбыліся і першыя культпаходы. Студэнты трэцяй групы, напрыклад, наведалі дзяржаўны тэатр імя Я. Купалы, паглядзелі спектакль «Зацюканы апостал» А. Макаёнка. Мяркуецца паездка ў Хатынь і іншыя месцы Мінска і вобласці.

Арганізавана прайшла падпіска на газеты і часопісы на 1972 год. У гэтым, трэба зазначыць, перш за ўсё заслуга камсамольскіх важакоў Жукава, Радзюк, Шыманоўскай.

На курсе аказалася шмат прыхільнікаў спорту, ахвочых займацца ў секцыях, выступаць у розных спаборніцтвах. Тут, пэўна, адыгралі сваю ролю выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту А. С. Саунін і старшыня спортклуба універсітэта С. Камінскі, якія прыходзяць заўжды на дапамогу, падказваюць, узважыўшы усе «за» і «супраць», у якую секцыю пайсці юнаку ці дзяўчыне, дзе яны змогуць дабіцца найбольшых поспехаў.

А поспех на спартыўнай ніве ўжо быў—у футбалістаў-першакурснікаў. Выхад каманды ў фінал расцэньвалі не інакш як сенсацыю, нешта невераготнае. У дэканаце, не без гордасці, чулася:

— Такое ў гісторыі журфака — упершыню.

Сенсацыі ж, здаецца, тут і няма. Імкненне да перамогі, згуртаванне футбольнага ансамбля ў каманду, здольную весці барацьбу ад пачатку да канца гульні, дало свой вынік—II месца. І хаця мы прайгралі ў фінале біёлагам—0:1, поспех, думаю, відавочны. І ў тым заслуга нападаючага Напрэева, Цітаўца, паўабаронцы Новікава.

З пачатку новага навучальнага года актывізавала сваю дзейнасць спартыўнае бюро факультэта, узначальваемае трэцякурснікам Аляксандрам Елісеевым. Прыемна, што ў яго склад ад нашага курса ўвайшлі тры чалавекі. Значыць, нам давяраюць, на нас спадзяюцца. А давер, вядома, трэба апраўдваць.

Бяжыць час, набліжаецца сесія — першая ў нашым жыцці. Якой яна будзе, пакажуць нашы веды, адказы. Імкнемся да лепшага.

**М. КАЛЯНКОВІЧ,**
**староста I курса журфака.**

● ПРАКТЫКА



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Урок — гэта толькі 45 мінут вучобы для школьніка. А для студэнта-практыканта — гэта сур'ёзны і адказны экзамен на права быць настаўнікам. 45 мінут урока—гэта і праверка ведаў, уменняў вучняў, і тлумачэнне тэарэтычнага матэрыялу, паўтарэнне папярэдняй тэмы і арганізацыя самастойнай работы.

# БУДНІ ФАКУЛЬТЭТАЎ

*На здымку: урок па рускай мове Л. Кушняровай абмяркоўваюць яе аднакурсніцы-практыканткі Л. Гардзяйчук, Л. Курачкіна, А. Сцепанюк і настаўніца А. С. Гарбацэвіч (другая справа).*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

● ПРАКТЫКА

# ЦЯЖКА Ў ВУЧОБЕ, ЛЁГКА Ў БАІ

Мая практыка ў верасні праходзіла ў школе № 61 г. Мінска. Як будучаму гісторыку мне трэба было праверыць цвёрдасць сваіх ведаў. Калі большасць гаворыць адразу аб поспехах, то я пачну перш за ўсё з цяжкасцей. Па-першае, патрэбен пэўны час, каб пазнаёміцца з вучнямі класа. А калі ў цябе тры класы, то аднаго месяца вельмі мала, каб пазнаць кожнага. Па-другое, вучням вельмі цяжка прывыкнуць да новага настаўніка. Па-трэцяе, не маючы вопыту выкладчыцкай работы, вельмі цяжка сачыць за класам, выкладаць матэрыял, прымушаць вучняў самастойна думаць.

Але побач з цяжкасцямі былі і радасці. Практыка ў школе яшчэ раз пацвердзіла вядомыя словы Суворава: «Цяжка ў вучэнні, лёгка ў баі». Я пераканаўся ў тым, што добрасумленна вывучаны матэрыял ва універсітэце з поспехам можа быць выкарыстан пры выкладанні праграмнага матэрыялу ў школе. І вучні 5, 8, 10-х класаў, калі расказваеш аб падзеях і фактах, раней ім не знаёмых, але звязаных з вучэбным матэрыялам, слухаюць з вялікай увагай.

У школе я пераканаўся, што прафесія настаўніка не лёгкая. Таму што, каб паспяхова выкласці матэрыял, трэба многа ведаць, многа вучыцца, рыхтавацца да кожнага ўрока.

Я хацеў бы праз газету падзякаваць усім выкладчыкам гістфака, якія далі мне глыбокія веды.

**У. КУПКО,**
**студэнт V курса гістарычнага факультэта.**



● НАВУКОВЫЯ СУСТРЭЧЫ

# ПА АКТУАЛЬНАЙ ПРАБЛЕМЕ

**На гэтым тыдні на хімічным факультэце праходзіў двухдзённы семінар па фатаграфічных працэсах з выкарыстаннем бессярэбранага праяўлення, скліканы па ініцыятыве камісіі па хіміі фатаграфічных працэсаў Акадэміі навук БССР. На семінары, акрамя прадстаўнікоў Беларусі, прысутнічалі спецыялісты Масквы, Ленінграда, Новасібірска і іншых гарадоў нашай краіны. Сярод іх вядомыя спецыялісты прафесар В. І. Шэберстаў, Р. П. Феерман, Я. А. Галашын і іншыя. Быў заслухан і абмеркаван шэраг актуальных дакладаў і паведамленняў, якія сканцэнтроўваліся на асноўным — на замене ў фатаграфічным працэсе дорагакаштуючага серабра больш таннымі благароднымі металамі.**

**Н. БЕЛЫ.**

● ПАЕЗДКІ І ЭКСКУРСІІ

# ДАПАМАГАЛА МОВА СЯБРОЎСТВА

У верасні група студэнтаў факультэта на чале са старшым выкладчыкам кафедры ЭВМ П. Л. Салавым знаходзілася на вытворча-азнаямленчай практыцы ў Іенскім універсітэце. Мэтай яе было азнаямленне з працай вядучых лабараторый і аддзелаў Іенскага універсітэта, выкананне курса лабараторных работ і знаёмства з краінай, з жыццём нямецкага студэнцтва.

Цёпла і сардэчна прымалі нямецкія сябры нашых студэнтаў. Перад імі шырока расчынілі дзверы найбольш цікавыя лабараторыі, вядучыя супрацоўнікі універсітэта расказвалі аб сваёй працы. Шмат цікавага і новага ўбачылі беларускія студэнты-фізікі — гэта і магутны іённы паскаральнік, і лабараторыі аддзела нелінейнай оптыкі, у якіх даследуюцца лазеры, і магутны тэлескоп, і шмат-шмат іншага... З цікавасцю выканалі студэнты курс лабараторных работ па даследаванню аптычных квантавых генератараў.

А колькі ўбачана ў паездках па краіне! Любаваліся палотнамі Дрэздэнскай галерэі, пабывалі на міжнародным кірмашы ў Лейпцыгу, аглядалі Берлін з назіральнай пляцоўкі новай тэлевізійнай вышкі, пабывалі ў вядомым Вартбургскім замку, наведалі Бухенвальд — помнік сотням тысяч людзей, загінуўшых ад рук фашысцкіх катаў.

І дзе б ні знаходзіліся нашы студэнты, усюды ў іх былі цікавыя сустрэчы з людзьмі навукі, студэнтамі, рабочымі. Асабліва цікава было даведацца аб жыцці студэнтаў. З сустрэч з кіраўніцтвам Саюза свабоднай нямецкай моладзі, рэдакцыяй студэнцкага журнала, дэканам секцыі фізікі Іенскага універсітэта прафесарам Альбрэхтам, з гутарак са студэнтамі даведаліся, як вучыцца і адпачывае нямецкая моладзь, якія праблемы яе хвалююць і як гэтыя праблемы вырашаюцца.

За той кароткі тэрмін, што фізікі знаходзіліся ў ГДР, у іх з'явілася многа сяброў сярод нямецкіх студэнтаў. Нягледзячы на цяжкасці з мовай, добра разумелі адзін аднаго. Шмат агульнага аказалася ў нашых студэнтаў і студэнтаў Іены, і таму было вырашана наладзіць рэгулярную перапіску паміж камітэтам камсамола фізфака і бюро Саюза свабоднай нямецкай моладзі секцыі фізікі Іенскага універсітэта, паміж студэнцкімі групамі.

«Да сустрэчы!» — гаварылі, развітваючыся, беларускія і нямецкія студэнты.

**В. ГАЙСЯНОК,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола фізфака, студэнт V курса.**

● ВУЧОБА І АДПАЧЫНАК

# АНКЕТА ПЕРШАКУРСНІКА

1. Адкуль прыехалі, чаму выбралі іменна гэты факультэт?
2. Уражанні аб занятках (лекцыях, практычных). Дзе звычайна рыхтуецеся, у якіх умовах, ці падабаюцца бібліятэка, чытальныя залы, як абслугоўваюць у бібліятэцы, ці цяжка канспектаваць работы класікаў марксізму-ленінізму? Ці часта выступаеце на семінарскіх?
3. Каго і чаму выдзяляеце сярод выкладчыкаў?
4. Ці прымаеце ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта? Якія наведваеце гурткі, спартыўныя секцыі?
5. Дзе харчуецеся? Ці заўсёды паспяваеце паесці?
6. Дзе жывяце і як?
7. Як выкарыстоўваеце вольны час (калі ён ёсць) і рабочы, ці ўсё задуманае паспяваеце зрабіць?

**Сяргей СТРАДЫМАЎ,**
**студэнт юрфака:**

— Паступіў ва універсітэт пасля службы ў радах Савецкай Арміі. Прыехаў з Гомеля. Чаму выбраў гэты факультэт? Падабаецца будучая прафесія. З лекцый найбольш цікавыя па гісторыі КПСС і судовай статыстыцы. Рыхтуюся да заняткаў звычайна ў чытальнай зале факультэта і дома. Работы класікаў марксізму-ленінізму канспектаваць, вядома, нялёгка — там усё галоўнае. На семінарскіх занятках выступаю па меры магчымасці і калі выклікае выкладчык. Займаюся ў секцыі вольнай барацьбы.

Абедаю звычайна ў студэнцкай сталовай, там танна і смачна. Паесці, праўда, не заўсёды паспяваю, але буду спадзявацца, што гэта часовая з'ява. Жыву пакуль на кватэры, але не трачу надзеі атрымаць месца ў інтэрнаце. У вольны час, калі, вядома, ён ёсць, працягваю знаёміцца з Мінскам.

Таня ТРЫКОЗ,
студэнтка гістфака:

1. Я — мінчанка. Гістарычны факультэт прывабіў мяне сваёй шматграннасцю. Бо ўсё, чаго мы дасягнулі, усё, што звязана з тайнай або загадкавасцю, усё зразумелае і незразумелае — гэта гісторыя. Гісторыя — навука невычэрпная, якую можна вывучаць усё жыццё і ўсё ж ведаць толькі малыя долі. У гісторыі заўсёды ёсць «белыя плямы». Гісторык — заўсёды першаадкрывальнік (па крайняй меры, для сябе) і даследчык. Гісторык — рамантык! І, вядома, гэта заўсёды цікавы чалавек.

2. Мае адносіны да заняткаў, да падрыхтоўкі яшчэ ў многім школьныя. Цяжка звыкнуцца з насычаным і імклівым універсітэцкім жыццём. Часта раней я «плыла па цячэнню». Цяпер жа гэта зусім немагчыма. Каб вучыцца ў БДУ, трэба не проста плыць... Мне цяпер цяжка сказаць, што ж патрэбна?.. Напэўна, аб гэтым трэба менш думаць, а проста аддацца ўсім сэрцам новаму для мяне студэнцкаму жыццю.

Рыхтуюся да семінараў я звычайна дома, таму нічога не магу сказаць ні аб універсітэцкай бібліятэцы, ні аб чытальнай зале.

Работы класікаў марксізму-ленінізму, вядома, нялёгкія для першакурсніка, але асабіста мне не толькі не цяжка чытаць Маркса, Энгельса, Леніна, але і цікава. На семінарах выступаю ў залежнасці ад падрыхтаванасці.

3. Напэўна, адносіны да таго ці іншага прадмета ў многім залежаць ад адносін да выкладчыка. Мне адразу ж вельмі спадабаліся лекцыі па археалогіі Э. М. Загарульскага, па гісторыі Старажытнага Ўсходу, якія чытае Г. І. Даўгяла.

4. На гэтае пытанне анкеты ў мяне адмоўны адказ: я не спартсменка, і спадзяюся, што толькі пакуль не прымаю ніякага ўдзелу ў грамадскім і камсамольскім жыцці універсітэта.

5. Абедаю я дзе давядзецца, хоць сама я мінчанка. Чамусьці іменна на абед і не хапае часу.

6. Жыву ў Мінску. Як жыву? Прасцей на гэтае пытанне адказаць: «нармальна».

7. Гэта вельмі дзіўна, але ў мяне ўжо даўно не было вольнага часу. Таму пытанне само сабой адпадае.

# ВОСЕМДЗЕСЯТ ПЯТАЯ УНІВЕРСІТЭЦКАЯ

«...З мэтай паляпшэння якасці падрыхтоўкі журналістаў арганізаваць кафедру тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання».

*(З загаду Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ад 30 жніўня 1967 г.).*

Усім, хто бывае ў гэтыя дні ва універсітэцкім гарадку, кідаецца ў вочы не зусім звычайная дзелавая мітусня: на двары стаіць шум машын, і жоўтае лісце падае на свежыя асфальтаваныя дарожкі; у калідорах і аўдыторыях пахне фарбай; на ўсіх паверхах карпусоў стукаюць малаткі — старэйшая ву рэспубліцы рыхтуецца ўрачыста адзначыць свой паўвекавы юбілей.

50 год прайшло з той пары, як ва універсітэт прыйшлі першыя студэнты. Паўвека, але універсітэт малады. І маладзее з кожным днём: усяго чатыры гады адной з самых маладых кафедр—кафедры тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання факультэта журналістыкі.

Факультэт журналістыкі ўпершыню адчыніў дзверы для будучых работнікаў нашага беларускага друку ў цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны. За гэты час 24 разы члены дзяржаўнай камісіі ўручалі дыпломы аб прысваенні высокага звання «журналіст» больш 1400 выпускнікам факультэта.

Работнікаў газет, часопісаў, выдавецтваў, радыё і тэлебачання рыхтавала адна кафедра тэорыі і практыкі журналістыкі, члены якой чыталі ўсе спецыяльныя дысцыпліны. У апошнія гады створаны ўмовы для далейшага павышэння якасці падрыхтоўкі журналістаў. Цяпер на факультэце працуюць чатыры кафедры: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання.

...«Прашу залічыць мяне ў групу спецыялізацыі па радыё- і тэлежурналістыцы. Супрацоўнічаю ў рэдакцыі перадач для моладзі Беларускага тэлебачання каля пяці год...» Гэта вытрымка з заявы загадчыку кафедры РТ дацэнту М. Е. Дастанку студэнткі трэцяга курса Марыны Багрый-Шахматавай. Такія просьбы падаюць на кафедру РТ пасля двух год навучання студэнты журфака, якія вырашылі спецыялізавацца ў галіне тэлевізійнай і радыёжурналістыкі. Выкладанне вядзецца па наступных дысцыплінах: гісторыя савецкага радыёвяшчання і тэлебачання, тэорыя і практыка радыё і тэлебачання, тэхніка мовы і дыктарскае майстэрства, фотасправа і фотарэпартаж. Распрацаваны спецкурсы і спецсемінары: «Ленін і радыё», «Публіцыстыка ў эфіры і на экране», «Савецкае радыёвяшчанне на зарубежныя краіны», «Зарубежнае радыё і тэлебачанне».

Жадаючых паслухаць спецыяльны курс па новых галінах журналістыкі, атрымаць навыкі літаратурнай і арганізатарскай работы на радыё і тэлебачанні многа. Студэнтаў прыцягваюць магчымасці ўжо на першай вучэбнай практыцы ў абласных камітэтах па тэлебачанню і радыёвяшчанню азнаёміцца з формамі і метадамі масавай работы рэдакцый, працэсам падрыхтоўкі і выпуску радыё- і тэлевізійных перадач. Яны навучаюцца тэхніцы запісу жывой мовы на магнітафон, мантажу плёнкі, рабоце над тэлесцэнарыем і перадачай, выкарыстанню «рэпарцёра».

Больш дэталёвае знаёмства са спецыфікай работы журналістаў на радыё і тэлебачанні студэнты атрымліваюць на пераддыпломнай практыцы на Беларускім радыё і рэспубліканскай студыі тэлебачання. Галоўная яе задача—замацаванне тэарэтычных ведаў, атрыманых ва універсітэце.

Студэнты выязджаюць у камандзіроўкі, прымаюць удзел у лятучках і іншых мерапрыемствах рэдакцый, у грамадскім жыцці творчых калектываў.

Наша кафедра кантралюе і аператыўна ўмешваецца ў ход практыкі. На Беларускім радыё і тэлебачанні праводзяцца выязныя пасяджэнні кафедры. На іх прысутнічаюць журналісты рэдакцый радыё і тэлебачання, у якіх студэнты праходзяць практыку. Тут абмяркоўваюцца матэрыялы, падрыхтаваныя непасрэдна будучымі радыё- і тэлежурналістамі.

Але не толькі ў час практыкі студэнты выходзяць у эфір са сваімі работамі. Выступаюць яны па радыё і тэлебачанню (як аўтары і вядучыя перадач) і на працягу ўсёй вучобы. Напрыклад, трэцякурснікі падрыхтавалі нядаўна 50-мінутную праграму «Рамантыкі», якая атрымала высокую ацэнку радыёслухачоў, тэлевізійны выпуск «Панарама навін». Студэнты IV курса — шэраг тэматычных раздзелаў у выпусках «Апошніх паведамленняў», сюжэтаў у тэлевізійных часопісах «Зорачка» і «Здароўе», 30-мінутную перадачу па пісьмах у праграме «Рамантыкі», каля 40 матэрыялаў для розных рэдакцый Беларускага радыё і тэлебачання.

Не адразу, канешне, нашых студэнтаў слухае і глядзіць уся рэспубліка. Самыя першыя іх гледачы... аднакурснікі, выкладчыкі. Якім чынам? Студэнты групы РТ выпускаюць сваю асабістую радыё-тэлевізійную праграму «Мы—на блакітным экране», прысвечаную жыццю факультэта. Выступаючы ў ролі аператараў, фотарэпарцёраў, рэжысёраў, дыктараў, рэдактараў, мастакоў, асвятляльнікаў, яны набываюць патрэбныя навыкі вядзення тэлевізійнай перадачы, выступлення перад мікрафонам.

Такім чынам, на працягу ўсёй вучобы ва універсітэце студэнты звязаны з практычнай работай радыё- і тэлежурналістыка. Не выпадкова таму выпускнікі выбіраюць тэмамі дыпломных работ, як правіла, пытанні падрыхтоўкі канкрэтных рубрык, праграм, цыклаў Беларускага радыё і тэлебачання. Распрацоўваюць яны і пытанні спецыфікі жанраў, работы рэпарцёраў, вядучых і г. д. Ствараюць летапіс развіцця радыёвяшчання і тэлебачання ў рэспубліцы. Многія тэмы «вырастаюць» з курсавых работ, з дакладаў у навуковым студэнцкім гуртку.

Напярэдадні пяцідзесяцігоддзя універсітэта кафедра імкнецца яшчэ больш павысіць тэарэтычны і метадалагічны ўзровень выкладання ўсіх дысцыплін, пашырыць сувязі з рэдакцыямі Дзяржаўнага Камітэта Савета Міністраў БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню і такім чынам палепшыць падрыхтоўку будучых радыё- і тэлежурналістаў.

**А. ПЛАЎНІК,**
**Л. ШЫЛАВА,**
выкладчыкі кафедры тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання.

# СТУДЭНТ, ВОІН, ПІСЬМЕННІК

У БЕЛАРУСКІ дзяржаўны універсітэт Мікола Лобан трапіў не адразу пасля скачэння педагагічных курсаў. Здарылася так, што першы год (1939—1940) ён займаўся на філалагічным факультэце Кіеўскага універсітэта і толькі потым пераведся ў Мінск, на філалагічны факультэт БДУ. Але і на радзіме вучоба была нядоўгай—таксама толькі адзін год.

Студэнты здавалі апошнія экзамены летняй сесіі 1941 года, калі пачалася вайна. У ваенным білеце Мікалая Паўлавіча Лобана значылася: прыгодны да нестраявой. Гэта, аднак, не змагло перашкодзіць яму пайсці ў дзеючую армію. Студэнт настаяў на сваім, і яго пасылаюць спачатку на кароткачасовыя курсы, а пасля на Волхаўскі фронт.

Але доўга ваяваць не давялося—яго ранілі. Мікола Лобан апынуўся ў медсанбаце, а затым—у шпіталі, якому хутка прыйшлося эвакуіравацца. У дарозе варожыя самалёты бамбілі эшалон. І да ранейшых ран дабавіліся новыя: былі перабіты ногі...

У 1942 годзе Міколу Лобана камісавалі з арміі. Пасля доўгіх месяцаў, праведзеных на ложках шпіталяў, ён апынуўся ў Казахстане, дзе ў пасёлку Келераўка (Паўночна-Казахстанская вобласць) выкладаў у школе рускую мову і літаратуру. Справа гэтая была знаёма Мікалаю Паўлавічу: да вайны яму давялося настаўнічаць на Любаншчыне і ў Пухавіцкім раёне.

Неяк на старонках «Комсомольской правды» Лобан сустрэў імя Цімоха Крысько (Васіля Віткі), творы якога друкаваліся яшчэ да вайны. Вітка і Лобан добра ведалі адзін аднаго, бо былі землякамі. Лобан вырашыў напісаць земляку-пісьменніку. Неўзабаве прыйшоў ліст. Так завязалася перапіска. Крысько дасылаў Лобану беларускія газеты і часопісы. Можна сабе ўявіць, з якім хваляваннем чытаў беларус-настаўнік такія выданні, як «Партызанская дубінка» або «Раздавім фашысцкую гадзіну»...

Лобан, як і многія, раскіданыя вайной па ўсёй краіне студэнты нашага універсітэта, з радасцю даведаўся з «Праўды» пра адкрыццё на Сходні Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Адразу ж паслаў ён туды заяву з просьбай аднавіць у радах студэнтаў. Вельмі хутка прыйшоў выклік на вучобу за подпісам Ц. Ломцева.

Тагачасны універсітэт — гэта невялікі двухпавярховы будынак, у якім не было ніводнае шыбіны. Такім яго застаў Мікола Лобан. На першым паверсе будынка была сталовая. Аб гэтым сведчыла наспех складзеная пліта (хутка павінны былі з'ехацца студэнты) ды голыя сталы, што стаялі ў беспарадку. Не ведаючы, дзе пераначаваць, Лобан застаўся на першую ноч у сталовай. Ссунуўшы два сталы, зрабіў такім чынам сабе «ложак».

Заняткі пачаліся не адразу. Спачатку трэба было прывесці ў належны парадак «універсітэцкі корпус»: зашкліць вокны, прывезці з розных месц кнігі для вучобы.

Студэнту Лобану было даручана выкладанне ваеннай справы. На кафедры ваеннай падрыхтоўкі, якую ўзначальваў тады Іван Паўлавіч Мележ, Лобан праводзіў заняткі па тапаграфіі і страявой падрыхтоўцы.

Харчовы рацыён студэнтаў быў тады небагаты. Спачатку выдавалася ўсяго па 300—400 грамаў хлеба напалову з бульбай; праўда, пасля, дзякуючы намаганням рэктара П. П. Савіцкага, студэнты сталі атрымліваць па 550 грамаў някепскага па тым часе «хімкаўскага» хлеба. З надыходам вясны можна было частавацца сезонным ласункам— баршчом з крапівы. Тады на Сходні нават такі жарт хадзіў:

Сабірайце крапіву
Для студэнтаў БДУ!

Нават пры вялікай занятасці вучобай Лобану ўсё ж хацелася болей працаваць, і ён звярнуўся да тагачаснага дэкана Міхаіла Іванавіча Жыркевіча з просьбаю знайсці для яго якую-небудзь работу. Жыркевіч паабяцаў пашукаць і ў хуткім часе прапанаваў студэнту паехаць у Маскву, у гасцініцу «Якар», дзе жыў тады навуковы супрацоўнік Акадэміі навук БССР Суднік. У АН БССР, якая знаходзілася ў гэты час у эвакуацыі ў Маскве, недалёка ад станцыі метро «Сокал» пачыналася работа па складанню руска-беларускага слоўніка. Кіраўніком слоўнікавай групы быў прызначан Пятро Фёдаравіч Глебка. Зусім натуральна, што акадэмія шукала філолагаў. І Лобан паехаў у «Якар». Спачатку Суднік правёў дыктоўку, а затым, упэўніўшыся, што мае справу з чалавекам, які выдатна ведае беларускую мову, дазволіў Лобану напісаць заяву.

З гэтага часу студэнт пачаў звязваць вучобу з работай у АН БССР, куды быў залічан на пасаду малодшага навуковага супрацоўніка. Заняткі тады не былі пастаяннымі. Выкладчыкаў не хапала, таму і лекцый было няшмат. Лобан прысвячаў увесь свой вольны час цалкам захапіўшай яго рабоце. Раніцай а 8-й гадзіне ён імчаўся на электрычку, бег затым па вуліцах Масквы ў бібліятэку імя У. І. Леніна, каб паспець да адкрыцця, і цэлы дзень працаваў. Сам пісьменнік успамінае: работнікі бібліятэкі, даведаўшыся, што ён родам са шматпакутнай Беларусі, аднесліся да яго з асаблівай прыхільнасцю. Яны далі ў яго распараджэнне асобны стол у зале і не адмаўлялі ні ў якіх кнігах. Там ён сядзеў, абклаўшыся вялізнымі тамамі, ажно да дзевятай гадзіны вечара. А потым вяртаўся назад, на Сходню.

Работа над слоўнікам была цяжкая і клапатлівая. Мікола Лобан быў адказны за літары С—Т—У. Яму трэба было сабраць усе словы, якія пачыналіся з гэтых літар, і раскласці іх у пэўным парадку. Колькі ўвагі і пільнасці патрабавала такая праца! Можна ўявіць сабе, які быў жах, калі аднойчы ў падземнай станцыі метро нехта ў людской мітусні выбіў з рук Лобана звязаныя і падрыхтаваныя да здачы карткі са словамі. Маленькія паперкі рассыпаліся па пероне, але, на шчасце, з дапамогай начальніка станцыі яны былі ўсе сабраны.

Універсітэцкае жыццё ішло сваёй чаргою. На Сходні была спроба стварыць літаратурны гурток, на чале якога стаў М. Р. Ларчанка (цяпер прафесар, загадчык кафедры філфака). І хоць дзейнасць гуртка была нядоўгай, нельга не ўспомніць яго добрым словам. У гуртку прачыталі свае першыя творы Іван Мележ і Мікола Лобан, а таксама Марыя Барсток, якая пісала тады вершы.

У Маскве М. Лобан сустрэўся са старым сябрам—Васілём Віткам. Неяк Вітка прапанаваў Лобану наведаць іх земляка — выдатнага беларускага пісьменніка Кузьму Чорнага. Сустрэча з Чорным, які жыў тады з сям'ёю ў гасцініцы «Якар», прастата і дасціпнасць гэтага чалавека запомніліся Лобану назаўсёды.

Фронт адыходзіў на захад. Трэцяе ліпеня 1944 года стала асаблівым святам для ўсіх сходненскіх студэнтаў: у гэты дзень быў вызвален Мінск.

Родны горад нельга было пазнаць. І ўсё ж гэта была родная, блізкая, знаёмая зямля! Універсітэт працягваў сваё жыццё...

Праз год, у жніўні-верасні 1945 года, М. Лобан здаваў дзяржаўныя экзамены па беларускай літаратуры, беларускай мове і асновах марксізму-ленінізму. Усе экзамены былі здадзены на выдатна.

Недзе ў час падрыхтоўкі да дзяржэкзаменаў Васіль Вітка прапанаваў выпускніку напісаць артыкул пра пачынальніка беларускай філалогіі Я. Ф. Карскага для часопіса «Беларусь». Артыкул хутка быў напісан і атрымаў станоўчы водзыў. Неўзабаве на старонках часопіса з'яўляюцца прысвечаныя ваеннай тэме яго апавяданні «На жалезцы», «Дачка», «Сяргейка», нарыс «Хвядос Шынклер»...

Крытыка і тады бачыла ў Лобану вельмі здольнага празаіка. Для нас жа важна тое, што ва універсітэцкія гады ў Міколе Лобану нараджаўся пісьменнік, будучы стваральнік шырока вядомых сёння раманаў «На парозе будучыні» і «Гарадок Устронь».

## Асеннія матывы



Фота В. ЖУКА.



# ПА ГАРАДАХ РАДЗІМЫ

СЁЛЕТА 2-й групе эканомгеографаў у час практыкі прадстаяла вывучыць Волга-Вяцкі, Паволжскі і Уральскі эканамічныя раёны. Падарожжа прайшло праз Маскву, Горкі, Казань, Чайкоўскі, Перм, Кунгур, Свярдлоўск, Першаўральск, Куйбышаў, Ульянаўск. Мы наведалі Краснакамскі цэлюлозна-папяровы камбінат, Камскую ГЭС, Першаўральскі наватрубны завод, Уральскі завод цяжкага машынабудавання, убачылі, як здабываецца залатаносная руда ў горадзе Беразоўскім.

Горкі запомніўся музеем А. М. Горкага. У Казані цікавым было знаёмства з музеем У. І. Леніна ва універсітэце імя У. І. Ульянава-Леніна, з экспанатамі мясцовага краязнаўчага музея, вялікае ўражанне зрабіў Казанскі Крэмль. У Кунгуры мы, вядома, не маглі не пабываць у славутай ледзяной пячоры. У Свярдлоўску прыцягнулі нашу ўвагу ўральскія геалагічны і краязнаўчы музеі і дом вядомага казачніка Паўла Бажова. Экскурсія па ленінскіх мясцінах у Ульянаўску і па Ленінскаму мемарыяльнаму комплексу застануцца для кожнага незабыўным успамінам.

А каб аднавіць жывыя ўражанні таго часу, трэба перагарнуць старонкі дарожнага дзённіка.

*21 ліпеня. Масква.* Усе мы вельмі хацелі пабываць у МДУ. І гэта нам удалося. Дзякуючы цудоўным экскурсіям і добрай іх арганізацыі наша група ўбачыла цікавейшыя калекцыі крышталяў, парод, мінералаў — калекцыі, якія з'яўляюцца гонарам факультэта.

*22 ліпеня. Горкі.* Першае, што звяртае на сябе ўвагу, месцазнаходжанне горада. Большая яго частка знаходзіцца на высокім беразе, у сутоцы Волгі і Акі. Розніца паміж вышынёй левабярэжнай і правабярэжнай частак дасягае 70 метраў.

У гэтыя дні горад рыхтуецца да свайго 750-гадовага юбілею, яго прадпрыемствы сустракаюць свята поспехамі ў камуністычным будаўніцтве...

Уладкаваліся мы ў інтэрнаце універсітэта імя Лабачэўскага. Душ і сталовая падмацавалі нашы сілы, і мы былі гатовы адправіцца ў музей А. М. Горкага.

Арганізаван музей у 1928 годзе, яшчэ пры жыцці пісьменніка. З 1932 года ён размяшчаецца ў доме дзеда А. М. Горкага—Кашырына. Тут мы пазнаёміліся з многімі малавядомымі старонкамі біяграфіі вялікага пралетарскага пісьменніка.

*24 ліпеня. Казань.* Наведалі музей У. І. Леніна ў галоўным корпусе універсітэта. У ім сабраны арыгіналы і копіі дакументаў, якія расказваюць аб пачатку рэвалюцыйнай дзейнасці маладога Ульянава. Захавана такой, як была ў час вучобы тут Уладзіміра Ільіча, аўдыторыя № 7.

У гэты ж дзень агледзелі славутасці Казанскага Крамля, экспанаты мясцовага краязнаўчага музея і цудоўны ансамбль будынкаў на Цэнтральнай плошчы горада, якая носіць імя У. І. Леніна.

На наступны дзень мы пакінулі Казань і на цеплаходзе «Севастопаль» працягвалі сваё падарожжа да горада Пярмі.

*28 ліпеня. Перм.* Горад сустрэў нас халаднаватым ветрам з Камы і змрочным негасцінным небам. Але гэта не перашкодзіла нашаму знаёмству з горадам і яго прадпрыемствамі. Цікавымі былі паездкі на Краснакамскі цэлюлозна - папяровы камбінат, да нядаўняга часу буйнейшы ў Савецкім Саюзе і Еўропе, і на Камскую ГЭС, наведанне Пермскай дзяржаўнай мастацкай галерэі з унікальнай калекцыяй карцін і краязнаўчага музея.

*31 ліпеня. Кунгур.* Спыніліся на турысцкай базе, якая знаходзіцца побач з вядомай Кунгурскай ледзяной пячорай. У гэты ж дзень зрабілі экскурсію па ёй. У пячоры вядома ўсяго каля 100 гротаў і 36 азёр. Тут davolі холадна—каля 2—3 градусаў ніжэй нуля, у некаторых месцах тэмпература плюсавая, таму вада ў азёрах не замярзае, але вельмі сцюдзёная і празрыстая.

*2 жніўня. Свярдлоўск.* Гэта быў наш самы працяглы прыпынак за ўсю паездку. У горадзе мы наведалі геалагічны музей і завод Уралмаш. У першым столькі прывабнага, што не ведаеш, куды і ў які бок глядзець: горны крышталь, пірыт, алмазы, вырабы з малахіту, рубіну, карунда, сапфіру.

Уральскі завод захапляе памерамі цэхаў і выпускаемых машын. Ля прахадной завода ў 1945 годзе ўзведзен манумент у памяць аб вялікім працоўным подзвігу ўралмашаўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны са словамі на пастаменце:

Снарадамі, танкамі,
тонамі сталі
Уральцы свяшчэнную
клятву трымалі.

*10 жніўня. Ульянаўск.* У гэтым горадзе нам здорава пашанцавала: удалося заказаць экскурсійны аўтобус. У час паездкі экскурсавод расказала аб жыцці сям'і Ульянавых у Сімбірску. Пабывалі мы на магіле Ільі Мікалаевіча Ульянава і ў Ленінскім мемарыяльным комплексе. Будынак знаходзіцца ў самай высокай частцы горада—Вянцы. Адсюль адкрываецца цудоўны від на Волгу і на шырокі паўтаракіламетровы мост праз раку. Дарэчы, апісаць усё гэта немагчыма, гэта трэба бачыць.

**І. ЖАБОН,**
**студэнт III курса геафака.**

# ЗДАРОЎЕ — ГРАМАДСКІ КЛОПАТ

Таварыства Чырвонага Крыжа універсітэта мае паўвекавую гісторыю, яно было адной з першых чырвонакрыжовых арганізацый Беларусі.

Цяпер ва універсітэце налічваецца каля 9 тысяч членаў Таварыства Чырвонага Крыжа. Штогод больш тысячы чалавек з'яўляюцца актыўнымі донарамі, і з іх палова — бязвыплатныя донары. Поле дзейнасці таварыства шматбаковае і вельмі неабходнае.

На кожным факультэце створаны нізавыя арганізацыі Таварыства Чырвонага Крыжа. Старшынямі іх выбраны: на матэматычным факультэце — Т. І. Рагачэвіч, прыкладной матэматыкі—В. А. Літвін, гістарычным —Л. Ц. Мірончыкаў, фізічным—Л. Р. Харытончык, біялагічным—Б. Ф. Осіпаў, хімічным—І. С. Вільтоўская, геаграфічным — В. П. Арская, філалагічным—Я. Б. Касакоўская, факультэце журналістыкі — П. І. Ларыёнава, юрыдычным — Л. В. Паўлава, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі—Т. Р. Каўхута, падрыхтоўчым факультэце — Г. А. Берзінь, у выдавецтве—Т. Л. Пісарэнка, друкарні—Л. М. Грыц.

Наша пярвічная арганізацыя Таварыства Чырвонага Крыжа тэрытарыяльна ўваходзіць у Кастрычніцкі раён. У верасні адбыўся актыў Таварыства Чырвонага Крыжа Кастрычніцкага раёна горада Мінска, на якім яго ўдзельнікі прынялі зварот да ўсіх членаў Таварыства Чырвонага Крыжа Кастрычніцкага раёна, якое заклікае:

— дасканала авалодваць асновамі медыцынскіх і санітарных ведаў, навыкамі аказання першай дапамогі, пастаянна прымяняць іх на практыцы, помнячы, што ў нашай краіне здароўе—грамадскае багацце;

— няспынна змагацца за высокую санітарную культуру на вытворчасці і ў быце. Разам з медыцынскімі работнікамі актыўна праводзіць санітарна-асветніцкую і прафілактычную работу, быць непрымірымымі да парушэнняў гігіенічных норм і правіл, выкараняць шкодныя для здароўя чалавека прывычкі.

Быць заўсёды гатовымі, нават у самых складаных умовах, прыйсці на дапамогу людзям, здароўю і жыццю якіх пагражае небяспека;

— шырока прапагандаваць важнасць пералівання крыві і донарства для выратавання жыцця хворых, асабістым удзелам памнажаць рады бязвыплатных донараў;

— лічыць доўгам сумлення, загадам сэрца клопаты аб інвалідах Вялікай Айчыннай вайны, састарэлых і адзінокіх хворых людзях, каб яны заўсёды адчувалі нашу дапамогу і цеплыню адносін;

— мацаваць санітарную абарону нашай любімай Радзімы, якая будуе камунізм.

Камітэты Чырвонага Крыжа, санітарныя актывісты раёна ўзялі абавязацельства прыкласці ўсе сілы для таго, каб наш родны Мінск быў горадам высокай санітарнай культуры, а Кастрычніцкі раён быў лепшым раёнам нашага горада.

**В. ЦІМАФЕЕЎ,**
**старшыня Таварыства Чырвонага Крыжа універсітэта.**

# НА СТАРЦЕ ПЕРШАКУРСНІКІ

У канцы верасня ў парку Перамогі быў праведзен крос сярод студэнтаў першых курсаў. У спаборніцтвах удзельнічала 9 факультэтаў, географы і радыёфізікі ў гэты дзень былі заняты на сельскагаспадарчых работах. Усяго на старт выйшла 1252 чалавекі.

З першых забегаў разгарэлася барацьба за прызавыя месцы, у выніку якой пераможцамі сталі прадстаўнікі біялагічнага факультэта, якія занялі І месца.

Наступныя месцы размеркаваліся так:

II месца — гістфак;
III месца — ФПМ;
IV месца — матфак;
V месца — фізфак;
VI месца — хімфак;
VII месца — юрфак;
VIII месца—журфак;
IX месца — філфак.

158 удзельнікаў выканалі разрадныя нарматывы: 22 чалавекі— II разрад (17 юнакоў і 5 дзяўчат); 136 чалавек — III разрад (41 юнак і 95 дзяўчат).

Канчатковыя вынікі будуць падведзены пасля ўдзелу ў спаборніцтвах каманд географаў і радыёфізікаў. Спартсмены гэтых каманд возьмуць старт у час правядзення асенняга агульнауніверсітэцкага кросу 24 кастрычніка 1971 года.

**С. КАМІНСКІ,**
**старшыня спартыўнага клуба.**





✻ Ля возера
✻ Адзіноцтва

Фотаэцюды **Д. Чаховіча** і **М. Дарожнага.**

# УСІМ, УСІМ!

**24 КАСТРЫЧНІКА 1971 ГОДА Ў ПАРКУ ПЕРАМОГІ АДБУДЗЕЦЦА КРОС, ПРЫСВЕЧАНЫ 50-ГОДДЗЮ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА.**

**ПАЧАТАК КРОСУ Ў 10 ГАДЗІН.**

**КАМАНДЫ, ЯКІЯ ЗОЙМУЦЬ ПРЫЗАВЫЯ МЕСЦЫ, БУДУЦЬ УЗНАГАРОДЖАНЫ ГРАМАТАМІ СПАРТЫЎНАГА КЛУБА.**

**АЗНАМЯНУЕМ ЮБІЛЕЙ БДУ МАСАВЫМ УДЗЕЛАМ У КРОСЕ!**

# «ТВОРЧАСЦЬ» АБІТУРЫЕНТАЎ

⊙ *Данко погиб, но он выполнил задачу, поставленную им перед собой.*

⊙ *Дед Щукарь неотделим от козла, с которым он борется.*

⊙ *В стихотворении «Стихи о советском паспорте» Маяковский рассказывал о том, как вагоновожатый проверяет паспорта.*

⊙ *Старуха Изергиль делится на три части.*

⊙ *Давыдов не мог разобраться в жизни хутора, он был для него сложной машиной, детали к которой нужно было подбирать самому.*

⊙ *В сердце середняка живет жалость-гадюка к своей худобе, которой он добровольно лишился.*

⊙ *В «Песне о Соколе» Горький противопоставляет двух животных: ужа и сокола, которые не могут жить под одной крышей.*

⊙ *Павке Корчагину и героям-молодогвардейцам было легче относительно совершения подвига.*

⊙ *Чичиков работал на дожности контрабандиста*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Зак. 1195. АТ 15186
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Т. 2000 экз.